Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад - сярэдняя школа»

# ЭКСКУРСІЯ ДА ПОМНІКА ЗАГІНУЎШЫМ ВОІНАМ-АДНАВЯСКОЎЦАМ.
(канспект экскурсіі)

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг. Грыцкевічы, 2022

Мэта: пазнаёміць дзяцей з жыццём людзей падчас Вялікай Айчыннай вайны; фарміраваць патрыятычныя пачуцці, цікавасць да мінулага Беларусі той мясцовасці, дзе яны жывуць; фарміраваць уяўленні аб гераізме; апавяданне выхаваццеля, пра Параду Перамогі, пра ўзнагароды той вайны.

Папярэдняя работа: выстаўка дзіцячых работ «Дзень Перамогі»,заняткі па выяўленчай дзейнасці, чытанне мастацкай літаратуры, разгляд ілюстрацый.

Актывізацыя слоўніка: Айчына, патрыятызм, ветэран, бой, бітва, сцяг, парад войскаў, воіны-аднавяскоўцы.

Ход экскурсіі:

Выхавальнік: Многія не вярнуліся з вайны, яны загінулі дзеля таго, каб на зямлі быў мір. Усе людзі памятаюць загінуўшых герояў у Вялікай Айчыннай Вайне. Ва ўсіх гарадах і сёлах ёсць памятныя мясціны, куды прыходзяць людзі для таго, каб ушанаваць памяць герояў, ускласці кветкі. У нас у аграгарадку таксама ёсць такое месца - помнік загінуўшым воінам - аднавяскоўцам.

Помнік загінуўшым воінам - аднавяскоўцам, які размешчаны ў цэнтры нашага аграгарадка. Там нельга крычаць, бегаць, ірваць кветкі, а трэба паводзіць сябе спакойна. Гэта такое месца, дзе людзі хвілінай маўчання дзякуюць загінуўшым героям і шануюць іх памяць. Цяпер мы з вамі наведаем гэтае месца. Наш шлях пачынаецца з руха па вуліцы. Давайце паўторым, як правільна ісці па вясковай вуліцы. (Дзеці паўтараюць правіла бяспечных паводзін на вуліцы).

Выхавальнік і дзеці спыняюцца каля ўвахода да помніка.

Выхавальнік: Дзеці, мы з вамі прыйшлі да помніка воінам-аднавяскоўцам, якія абаранялі нашу вёску ад ворагаў у гады вайны. Давайце падыдзем бліжэй і разгледзім яго.

Аповяд выхаваццеля.

Выхавальнік: 22 чэрвеня 1941 года - адна з самых сумных дат у гісторыі нашай краіны, дзень, які нельга забываць. У той далёкі летні дзень людзі займаліся звыклымі справамі. Школьнікі рыхтаваліся да выпускнога вечара. Дзяўчынкі будавалі буданы і гулялі ў гульні, хлопчыкі скакалі конна на драўляных коніках, уяўляючы сябе чырвонаармейцамі. І ніхто не падазраваў, што і прыемныя клопаты, і дзіцячыя гульні перакрэсліць адно страшнае слова - вайна. 22 чэрвеня нагадвае нам пра ўсіх загінулых, закатаваных у тыле ад голаду і нягод. Гэта была страшная вайна, ваявалі не толькі салдаты, але і простыя людзі, якія ніколі не трымалі ў руках зброі. Так на абарону нашага аграгарадка ўсталі нашы аднавяскоўцы.

9 мая 1945 гады нашы войскі здолелі перамагчы ворага. З таго часу ўвесь наш народ святкуе 9 мая - Дзень Перамогі.

Пасля заканчэння вайны па ўсёй краіне сталі ствараць помнікі героям, людзям, якія перамаглі ў вайне.

Так і ў нашым аграгарадку стварылі помнік воінам – аднавяскоўцам.

(Прачытаць словы падзякі і пералік прозвішчаў указаных на помніку).

Мастацкае слова:

“Ніколі не забудзем”
Мы – дзеці сучасныя, дзеці разумныя
Ніколі не забудзем падзеі тыя сумныя
Пра тых, хто ваяваў, жыццё сваё аддаў,
Радзіму нашу для патомкаў зберагаў.

На фронце мужна ваявалі,
Матуль сваіх успаміналі.
Зямля ім сілы прыдавала,
У бой вяла і поспехаў жадала.
Пра цяжкасці вайны ў кніжках мы чыталі
І шмат чаго нам ветэраны расказалі.
Пра тых людзей, каго нямо ўжо каля нас
Мы ўспамінаем ў школе і не раз.

Пра тых салдат, што перамогу атрымалі,
Фашыстаў-ворагаў усіх прагналі
Мы абяцаем сёння усім людзям
Пра тых, хто ваяваў – ніколі не забудзем!

Выхавальнік: Дзеці, каго можна назваць абаронцамі Айчыны? (адказы дзяцей).

- Так, тых, хто абараняе сваю Радзіму ад ворагаў. Народ памятае аб тых, хто загінуў, абараняючы сваю краіну.

Так і нашы аднавяскоўцы баранілі нашую вёску ад нямецкіх захопнікаў.

Выхавальнік: Як народ памятае сваіх абаронцаў? (Складае песні, вершы, узводзіць помнікі, захоўвае матэрыялы аб абаронцах Айчыны ў музеях).

Але ёсць людзі, якія прайшлі ўсю вайну і вярнуліся дадому з фронта. Як мы іх называем?

Дзеці: Ветэраны.

Выхавальнік: Правільна, гэта нашы ветэраны. Давайце аб іх таксама ніколі не будзем забываць.

Выхавальнік: Мы з вамі ведаем шмат прыказак аб Радзіме давайце ўспомнім іх яшчэ раз.

Няма нічога прыгажэй, чым Радзіма наша.

Жыць - Радзіме служыць.

Радзіма - маці, а за маці не шкадуй і жыццё аддаць.

Радзіма - маці, умей за яе пастаяць.

Выхавальнік: Давайце, мы ціхенька пакладзем кветкі і ўшануем памяць хвілінай маўчання.

Заключная частка.

Выхавальнік: Сёння мы з вамі даведаліся аб тым, калі пачалася вайна, якім коштам дасталася нашаму народу Перамога. Раскажыце сваім блізкім і

сябрам аб нашай экскурсіі. Пагаварыце на гэтую тэму з дарослымі дома. Дзеці задаюць пытанні, дзеляцца сваімі ўражаннямі.







ОТДАВШИМ
ЖИЗНЬ
ЗА
СВОБОДУ
И
НЕЗАВИСИМОСТЬ
РОДИНЫ


СЛАВА
землякам,
отдавшим
жизнь
за
свободу
и
независимость
Родины